№ 6(258) 2014 г.

ГРОДНЕНСКИЕ ЕПАРХИАЛЬНЫЕ

ВЕДОМОСТИ

ЕЖЕМЕСЯЧНАЯ ГАЗЕТА ГРОДНЕНСКОЙ ЕПАРХИИ ОСНОВАНА В 1901 Г. ВОЗОБНОВЛЕНА В 1992 Г.

Архиепископ Артемий принял участие в торжествах в честь Жировичской иконы Божией Матери



20 мая 2014 года Высокопреосвященнейший Артемий, архиепископ Гродненский и Волковысский, принял участие в торжествах в честь Жировичской иконы Божией Матери, проходивших в Свято-Успенском Жировичском монастыре. Божественную литургию в этот праздничный день возглавил Высокопреосвященнейший Павел, Митрополит Минский и Слуцкий, Патриарший Экзарх всея Беларуси в сослужении членов Синода Белорусской Православной Церкви, епископа Владимир-Волынского и Ковельского Владимира и сонма духовенства. По окончании Литургии был совершен крестный ход с Жировичской иконой Божией Матери.

Священная война и правда Креста

Без малого сто лет назад по всем странам Европы стали служить молебны о «победе на супротивныя»: только по одну сторону фронта молились православные священники о православных русских войсках, по другую – католические и лютеранские об австрийских и германских. Год молились, другой, а на третий – рухнула православная империя в России. А на четвертый – католическая и лютеранская в Австрии и Германии.

Подробнее на стр. 9

Преподобная Евфросиния Полоцкая

В продолжении серии статей о жизни белорусских святых, начатой в прошлом номере нашей газеты, предлагаем читателям познакомиться с жизнеописанием преподобной Евфросинии Полоцкой, стоявшей у истоков белорусского монашества, потрудившейся на ниве книгопечатания и христианского просвещения народа.

Подробнее на стр.7



Протаіерэй Грыгорый Бяляцкі: «Сацыяльнае служэнне Царквы заўсёды засноўваецца на людзях»

Бог ёсць Любоў, Бог ёсць міласць. І каб быць побач з Богам, каб сапраўды Яго спазнаць, мы, хрысціяне, таксама павінны быць міласцівымі, павінны любіць тых, хто вакол нас, тых, каму патрэбная наша дапамога. Нездарма галоўнымі запаветамі Госпада нашага з'яўляюцца менавіта запаветы любові. Хрыстос кажа нам: "Возлюби Господа Бога твоего всем сердцем твоим, и всею душою твоею, и всею крепостию, и всем разумением твоим. Сия есть первая и наибольшая заповедь. Вторая же подобная ей: Возлюби ближнего твоего, как самого себя".

Подробнее на стр. 5

■ **Архиерей**

ДЗЕНЬ УСІХ СВЯТЫХ



“Я пайду ад вас, але вы прымеце сілу, калі Дух Святы сыдзе на вас”, – сказаў Хрыстос Сваім вучням перад Галгофай. І вось у дзень Пяцідзесятніцы Дух Святы сышоў на Апосталаў, увайшоў як сіла, якой прасякнута ўсё ўнутранае жыццё, і яны сталі далучанымі да Найвышэйшых Ведаў і прывялі да Хрыста свет. У гэты дзень рэальна ў бачным свеце адкрылася глыбіня і веліч свету нябачнага. З гэтага дня, кіруемыя Духам Святым Апосталы і іх вучні – свяцілі, мучанікі, вызнаўцы веры, – адважна пайшлі ў свет і схілілі яго да ног Хрыста. Ім прысвечаны сённяшні нядзельны дзень. Збіраючы іх разам – тых, хто ўзаемна звязаны адзінай верай і адзінай любоўю да Хрыста, нягледзячы на тое, што належылі яны да розных расаў і народаў, да розных саслоўяў, – Царква ўслаўляе іх урачыстым гімнам, усклікаючы: ”Дзіўны Бог у святых Сваіх”.

Сённяшні дзень – Дзень усіх святых – гэта свята сусветнай Хрыстовай Сям'і. Гэта вялікая, Царквою ўшаноўваемая сусветная сям'я, або, лепш сказаць, сусветнае Хрыстова брацтва, сведчыць і пра тое, што і ва ўмовах знешняга фізічнага рабства можна дасягнуць духоўнай свабоды. Для гэтага патрэбна толькі цвёрдасць хрысціянскіх перакананняў, цвёрдасць характару і ўнутраная набожнасць.

Шанаванне ўсіх святых з'яўляецца як бы адказам Царквы на ўсё тое, што зрабіў дзеля выратавання чалавецтва Сын Божы, Які ўцялесніўся на зямлі, не перастаючы пры гэтым быць Богам, і навучыў людзей, як жыць, даў ім Сваё Слова, пацярпеў пакуты за нас, грэшных, узяўшы на Сябе ўсе нашы грахі, памёр для нашага збаўлення, уваскрэс у Славе, а потым узнёсся на Нябёсы і пасадзіў там нашу чалавечую прыроду, якую Ён навекі прыняў у Сваю Боскую Асобу, праваруч Бога Айца.

Святасць – гэта дар, пасланы нам з Крыжа, дар свабоды, дар адданасці і вернасці Богу, дар магчымасці быць далучаным да Яго быцця. Прыналежнасць да Яго Царства, Яго жыццё, дадзенае нам у нашай святасці, – гэта плод ахвяры Сына Божага, прынесенай на Крыжы за ўсіх без выключэння. Сонмы ўмацаваных Святым Духам падзвіжнікаў пайшлі па выратавальнаму крыжоваму шляху, указанаму Госпадам. Царква Хрыстова трымаецца на крыві мучанікаў, пралітай у імя Божае. Хрыстос жыве ў кожным прысвечаным Яму сэрцы, і ў нашай святасці адбываецца сёння Яго Уваскрасенне. Гасподзь даў кожнаму з нас магчымасць прыняць гэты дар. Святыя айцы вырашылі адзначаць гэта свята пасля Дня сашэсця Святога Духа, каб паказаць тыя плады, якія прынесла яно праз апосталаў, і як яно, асвяціўшы людзей, умудрыла іх, узвысіла і ўзвяло на ступень ангелаў і прывяло да Бога, узнагародзіўшы прамяністым вянцом адных за подзвігі мучаніцтва, другіх за праведнае жыццё, трэціх – за непахісную веру.

Для свету жыццё і подзвігі святых – заўсёды незразумелая для розуму таямніца. Свет здзіўляецца, калі чытае або чуе пра людзей, якія ”верою перамагалі царствы, аказвалі справядлівасць, атрымлівалі абяцанні, закрывалі пашчы львам, тушылі полымя агню, усцерагаліся смерці ад вастрыя мяча, ачуньвалі ад немачы, былі стойкімі ў баях, змушаючы ўцякаць палкі ворагаў; … нацярпеліся здзекаў і біцця ды яшчэ кайданоў ды астрогу. Каменнем пабітыя былі, перацертыя былі, спакушаемыя былі, гінулі яны ад мяча, туляліся ў авечых і казліных шкурах, жылі ў горы,нястачах і прыгнёце. Не варты быў іх увесь свет, а блукаліся па пустынях, па гарах, у пячорах і шчылінах зямлі.” (Яўр.11: 33-34, 36-38). Так апостал Павел пісаў пра подзвігі, якія здзяйснялі ўсе святыя апосталы, ды і ён сам таксама. І не выпадкова гэтыя словы чыталіся сёння падчас Літургіі: яны вельмі дакладна і справядліва сведчаць пра тыя ўчынкі, якія здзяйснялі святыя падзвіжнікі веры.

”Кожнага, хто вызнае Мяне перад людзьмі, таго вызнаю і Я перад Айцом Маім, Які ёсць у нябёсах; а хто адрачэцца ад Мяне перад людзьмі, ад таго адракуся і Я перад Айцом Маім, Які ёсць у нябёсах.” (Мф.10:32-33). Гэта сказаў Гасподзь вучням Сваім, якія тады стаялі перад Ім; гэта сказаў Гасподзь, Які бачыў аддаленае будучае быццам сучаснае; сказаў ўсім без выключэння вучням Сваім усіх часоў і краінаў; сказаў Гасподзь гэта і нам – тым, хто стаіць сёння тут, у храме Яголым, і хто ўпісаў сябе ў лік Яго вучняў, калі прымаў святое Хрышчэнне… Вучні Госпада – не тыя, хто толькі ад імені Яго называюць сябе хрысціянамі, вучні – гэта тыя, хто сапраўды вызнаюць Яго Госпадам сваім і кіруюцца ў жыцці Яго вучэннем, выконваючы запаведзі Божыя.

Вызнанне веры павінна здзяйсняцца розумам, словам, справамі, усім жыццём. Сорам, нерашучасць, ваганні – недапушчальныя ў справе вызнання веры. Вызнанне патрабуе рашучага самаадмаўлення. Яно павінна быць урачыстым. Яно павінна адбывацца … перад чалавецтвам, перад ангеламі святымі і ангеламі палымі, перад вачамі зямлі і неба… Устаноўленае Богам вызнанне чалавекам Бога ёсць знак абранння Богам таго чалавека. Вызнанне слабое, двухсэнсоўнае не прымаецца, адмаўляецца як нявартае Бога. Недастаткова вызнаваць Бога ў глыбіні душы: неабходна вызнанне вуснамі і словамі. Недастатковае вызнанне словамі: неабходна вызнаваць Бога сваімі справамі і сваім жыццём. Таму адрачэнне ад Хрыста бывае поўнае і яўнае, калі чалавек яго прамаўляе сваімі вуснамі – не дай Бог зрабіць такое, – а бывае прыхаванае, таемнае, і, магчыма, яно больш небяспечнае. Размова ідзе пра той выпадак, калі мы саромеемся жыць у адпаведнасці з запаведзямі Божымі і хочам быць не сярод абраннікаў Божых, сапраўдных хрысціянаў, пра якіх Гасподзь гаворыць: ”Не бойся, малы статак!” (Лк.12:32), – а хочам быць “як усе”.

Калі мы саромеемся жыць па-хрысціянскі, то павінны выразна ўсведамляць, што Гасподзь наш Ісус Хрыстос, Якога мы быццам бы любім, дзеля Якога нібыта жывем (а некаторыя з нас нават пакінулі свет дзеля Яго), пасаромеецца нас і адрачэцца ад нас перад Богам. Усё наша знешне хрысціянскае жыццё – жыццё марнае, калі няма шчырага ўнутранага, жыццёвага, сардэчнага імкнення да Бога, якое праяўляецца, канешне ж, і ў справах – не ў тых, якія адабраюць усе тыя, што вакол нас, а ў тых, здзяйсняць якіх загадвае нам наша сумленне.

”І хто не бярэ Крыжа свайго і не ідзе ўслед за Мною, той не варты Мяне”. Многія людзі хочуць ісці за Госпадам, але пры гэтым не жадаюць цярпець нічога непрыемнага. Аднак, як сказаў свяцілель Ігнацій (Брянчанінаў), якім бы мудрым ні быў чалавек, жыццёвых непрыемнасцяў і пэўных выпрабаванняў пазбегнуць яму немагчыма. І каб ісці за Хрыстом, мы павінны быць гатовы вызцярпець і пакуты – гэта значыць, панесці свой ўласны жыццёвы крыж, падобна да таго, як у старажытнасці асуджаныя на смерць праз распяцце на крыжы самі неслі на сабе крыж да месца пакарання (у Рымскай імперыі нясенне крыжа было часткай гэтага страшнага пакарання). Калі мы жадаем ісці ўслед за Госпадам, але не хочам несці свой уласны жыццёвы крыж – гэта значыць, што мы не падрыхтаваны да пакутаў і выпрабаванняў, загадзя не настроілі сябе на тое, што прыйдзецца нам выцярпець і цяжкія скорбі, і абразлівыя зняважанні дзеля таго, каб быць сапраўднымі вучнямі Хрыстовымі, – то мы не зможам быць вартымі Госпада Ісуса Хрыста і, канешне ж, не зможам выканаць Яго запаведзі.

Мы ведаем, што апосталаў выгналі з роднай краіны іх жа суайчыннікі – габрэі, і што вучні Збавіцеля жылі сярод іншых народаў: грэкаў і рымлян, якія прытрымліваліся зусім іншых звычаяў. Аднак апосталы лічылі гэта радасцю, таму што цярпелі ўсё ў імя Хрыстова, і гэты іх подзвіг зусім не такі нязначны. Прападобныя айцы розных часоў пакідалі сваю радзіму і ішлі падвізацца ў далёкія краіны, як, напрыклад, Іаан Касіян Рымлянін, які з заходняй часткі Рымскай імперыі прыйшоў у Егіпет. Арсеній Вялікі, адзін з самых адукаваных людзей свайго часу, які належыў да культурнай нацыі грэкаў,падвізаўся таксама ў Егіпце сярод манахаў, якія паходзілі з простых неадукаваных сялян і нават не ведалі агульнай культурнай мовы таго часу – мовы грэчаскай. Угоднікі Божыя дзеля выратавання сваёй душы былі гатовыя адмовіцца ад усяго. Мы ж, у параўнанні з імі, вельмі і вельмі нямоглыя, слабыя і кволыя і целам і духам, і наша адмаўленне вельмі сціплае, калі можна так сказаць, нават калі мы робім гэта шчыра і ад усёй душы. Фактычна, мы яшчэ ні ад чаго не адмовіліся нават знешне.

Будзем пільнымі, узлюбленыя, бо зараз час адступлення. Свет усё больш і больш адступае ад евангельскіх асноваў веравучэння і ад здаровых маральных пачаткаў жыцця чалавецтва. Яшчэ ніколі не адбывалася ў свеце таго, што адбываецца сёння на нашых вачах. Бачачы ўсё гэта, мы павінны помніць, што Гасподзь чакае ад нас вернасці. У Апакаліпсісе Гасподзь, звяртаючыся да аднаго з прадстаўнікоў Цэркваў, гаворыць: ”Ведаю Я цябе: ты няшмат маеш сілы, але выстаяў, быў верным і захаваў слова цярпення Майго, і за гэта і Я захаваю цябе ад таго, што насоўваецца на ўвесь свет, ад гадзіны спакушэння і ад страшнай кары за яго.” Неабходна толькі клапаціцца пра тое, каб быць нам вернымі Госпаду, асабліва цяпер, у гэты страшны час. Святыя айцы любілі казаць і шмат разоў казалі, што хрысціянін, які захавае вернасць Свайму Госпаду ў гэтыя страшныя апошнія часы, у адпаведнасці з судом праўды Божай, будзе вышэй за старажытных вялікіх падзвіжнікаў! Гэта шмат разоў казалі святыя айцы, толькі не трэба баяцца, а трэба помніць, што Гасподзь не дазволіць крыўдзіць тых, хто застаўся верным Яму. Будзь верны Богу, і Гасподзь захавае цябе ад усіх бедаў, якія пагражаюць свету! Канешне, нельга не здрыгануцца, разумеючы, да чаго чалавецтва рыхтуе сябе, але помніце, што Гасподзь здольны абараніць сваіх! Толькі б мы былі верныя Яму, а Ён Сам Сабе заўсёды верны і заўсёды будзе нашым Абаронцам, Збавіцелем і Аховаю. Многія могуць памылкова думаць, што чалавек становіцца ўгодны Богу толькі праз пакутніцкі або манаскі подзвіг. Але гэта не так. Вяршыня святасці ў тым, каб любіць кожнага чалавека, які сустракаецца на жыццёвым шляху, як самога сябе. Пачні з малога: гневаешся на каго-небудзь – прамаўчы, пакрыўдзілі цябе – не помсці, можаш каму-небудзь дапамагчы – дапамажы.

Мэта хрысціяніна – Царства Нябеснае, але шлях туды нялёгкі. Нас папярэдзіў Хрыстос: Царства Нябеснае дасягаецца сілаю, і тыя, што сілу ўжываюць, здабываюць яго (Мф.11:12). Таму пакінем у гэты дзень усе побытавыя будзённыя клопаты, якія паглынаюць усё наша жыццё, паглядзім на тых, хто ўжо дасягнуў гэтай жаданай мэты – Царства Нябеснага, і звернемся да іх з малітоўным прашэннем: усе святыя, маліце Бога за нас!

Такім чынам, прыложым і мы намаганне да намагання, каб на ўсіх шляхах жыцця нашага захаваць свабоду: быць свабоднымі ад грахоў, ад усякага бруду, каб і праз нас праслаўлялася ў свеце гэтым імя Госпада Ісуса Хрыста – Збавіцеля нашага і ўсяго свету.

Благотворительный марафон «15 дней в защиту жизни и семьи»

Благотворительный марафон «15 дней в защиту жизни и семьи», посвященный Международному дню семьи и Международному дню защиты детей 18 мая стартовал в Гродно. Организаторами марафона выступили координационный совет Гродненской епархии Белорусской Православной Церкви по вопросам защиты материнства и семейных ценностей, Государственное учреждение «Гродненский зональный центр гигиены и эпидемиологии», Гродненский центр защиты жизни и семьи «РадзиМа», Православный клуб многодетных семей «Возрождение», семейный центр «Рамонак» Свято-Иоанно-Предтеченского храма г. Гродно, Гродненское благотворительное общество, Свято-Марфинское православное братство, молодежное братство в честь прпмч. Афанасия Брестского.

В программу мероприятий входила замечательная позитивная фотовыставка «Линия жизни» детского и семейного фотографа Людмилы Фадеевой.

В будние дни в актовом зале на 2 этаже приходского комплекса Свято-Покровского кафедрального собора (ул. Академическая, 2) можно было увидеть фотовыставку, прослушать лекции «С любовью к своей семье», получить индивидуальные консультирования врача-валеолога и психолога отдела общественного здоровья Гродненского зонального ЦГЭ по вопросам создания здоровой семьи, беременности, профилактики вредных привычек, формирования здорового образа жизни, посмотреть выставку в защиту нерожденных младенцев «Спасай взятых на смерть». В субботу 24 мая состоялись: встреча «Как сохранить здоровье семьи» с участием врача-педиатра, специалиста в области защиты семьи и жизни, консультанта по послеродовому периоду Натальи Железной; выступление дизайнера Сидорович Светланы, руководителя творческой студии семейного центра «Рамонак» по теме «Создание психоэмоционального комфорта в семье, гармоничное развитие ребенка с помощью простейших приемов дизайна»; психологический тренинг психолога Каратцай Риммы Ивановны по теме «Принятие особого ребенка в семье».



В воскресенье 25 мая состоялся молебен под открытым небом о защите детей в утробе матери и сохранении жизни, об укреплении семей перед иконой Божией Матери «Помощница в родах» (на площадке Свято-Покровского кафедрального собора). После этого был проведен авто-мотопробег «Гродно – в защиту жизни».

В субботу 31 мая была проведена духовно-просветительская беседа «Православное воспитание детей в семье» с участием координатора Гродненской епархии Белорусской Православной Церкви по вопросам защиты материнства и семейных ценностей иереем Александром Гуком.

В воскресенье 1 июня состоялось закрытие марафона. С 10.00 до 13.00 проходила уличная акция «Свеча памяти» в защиту жизни нерожденных детей (на площадке Свято-Покровского кафедрального собора).

В 12.00 был отслужен молебен под открытым небом в память нерожденных детей перед иконой Вифлеемских мучеников.

Давайте вместе делать мир вокруг нас лучше!

Давай вместе создавать цивилизацию жизни и любви в своей семье, в своём городе, в своей стране!

Марина ***ВОЛОЧКОВА***

Визит хора священнослужителей Гродненской епархии в Румынию



С 20 по 24 апреля 2014 года, по благословению Высокопреосвященнейшего Артемия, архиепископа Гродненского и Волковысского, состоялся визит священнослужителей Гродненской епархии в Румынию. В этом году фестиваль «Коложский благовест» посетил ансамбль священнослужителей из Рэдэуци (Румыния), который поразил всех своим прекрасным пением. И во время фестиваля участники коллектива пригласили хор священнослужителей приехать с ответным визитом.

21 мая хор священнослужителей Гродненской епархии под руководством диакона Дмитрия Шепелева выступил в городе Сучава. Зал вместимостью 450 человек был полностью заполнен публикой. В исполнении гродненского хора прозвучали песнопения свящ. В.Зиновьева, А.Архангельского, свящ. А. Шашкова, свящ. А.Бондаренко.

В течение всего визита хор неоднократно выступал перед публикой. В репертуаре коллектива присутствовали как богослужебные, так и народные произведения. Преимущество отдавалось произведениям белорусских авторов и произведениям на белорусском языке. Таким образом, жители далекой Румынии имели возможность прикоснуться к богатой белорусской культуре, которая никого не оставила равнодушным.

диакон
Александр ***КОЛАЦКИЙ***

Молитва в красках

Новая жизнь у человека начинается с личной встречи с Богом. Счастлив тот, у кого эта встреча произошла в раннем



детстве: при посещении храма, через молитву мамы или благодаря рассказам бабушки. У многих детей встреча с Богом происходит с поступлением в воскресную школу.

В нашей школе при храме иконы Божией Матери «Всех скорбящих Радость» г. Мосты учащиеся не только изучают Закон Божий, Священное Писание, историю Православной Церкви. Внеклассная работа занимает важное место в жизни наших воспитанников. Каждый может здесь найти занятие по душе. Ребята поют, рисуют, читают, играют в театральных постановках. Окончание нынешнего учебного года решили отметить по новому: подготовить и провести «Вечер послушания и полезных советов». В организации репетиций, обсуждении и подготовке костюмов помогали родители, бабушки и дедушки, что объединило и сблизило и взрослых, и детей.

Праздник состоялся в последнее воскресенье мая. Воспитанники воскресной школы исполняли песни, читали стихи, принимали участие в инсценировках. Речь шла о необходимости всегда благодарить Бога и начинать дело с молитвы, о послушании родителям, об уважении к взрослым, о правилах поведения на каникулах, о правильном питании и полезных продуктах. Теплые слова признательности были посвящены маме. Ребята могли воочию убедиться, к чему приводит несобранность, отсутствие самодисциплины. Все выступления оказались поучительными и с юмором. Дети старались, хотели порадовать родителей, преподавателей, друзей. И им это удалось! А мы, родители, гордились своими чадами, радовались их искренности, непосредственности, находчивости. Выпускники получили напутственные слова и памятные подарки.

После концерта все вышли на улицу, вооружившись цветными мелками. И очень скоро на асфальтной площадке засияло солнце, появились облака, выросли деревья и цветы, выстроились в ряд дома. Это была не только картина Божьего мира, но и молитва Богу и Его Святым подвижникам о семье, о доме, о Родине.

«Творческие способности суть проявления образа Божия в человеке. Церковь благословляет творчество, открывающее новые горизонты для духовного возрастания человека и для познания сотворенного мира», - сказано в «Основах учения Русской Православной Церкви о достоинстве, свободе и правах человека». Нам Господь даровал замечательную возможность - пройти все этапы взросления наших детей вместе с ними. Быть рядом, радоваться их успехам, подать руку при падении, утешить, поддержать в сложных ситуациях - милость Божия в отношении нас. Мы, родители, должны стать для детей примером, достойным подражания, вложить в них все свои силы, знания, навыки. Чтобы как можно лучше преуспеть в деле спасения души своей и наших детей, чтобы сполна осуществить замысел Творца в отношении всех нас.

Когда мы фотографировались, старшие ребята высоко над головой держали плакат, где крупными буквами были написаны слова молитвы «Усе Святыя зямлі Беларускае, маліце Бога за нас!» И мы искренне верим и знаем, что наши святые непременно нас слышат и не оставят никогда без заступничества и помощи!

Татьяна ВОЛКОВИЧ

Паніхіда ў памяць Максіма Багдановіча ў Каложы

25 мая 2014 года ў Гродзенскай епархіі адзначылі гадавіну смерці выдатнага беларускага паэта, “песняра чыстай красы” Максіма Багдановіча. У гэты дзень у старажытнай Свята-Барыса-Глебскай Каложскай царкве была адслужана паніхіда ў памяць паэта, яго маці Марыі і бацькі Адама. Малебен на беларускай і царкоўнаславянскай мовах праводзіў настаяцель храма протаіерэй Аляксандр Балоннікаў у саслужэнні протаіерэя Георгія Роя і дыякана Уладзіміра Юзвы.

Пасля паніхіды ў сваім слове протаіерэй Аляксандр падкрэсліў, што паэт пражыў нядоўгае жыццё, але пакінуў нам вялікую творчую спадчыну, якая будзе нагадваць аб ім вечна. Лёс Багдановіча з’яўляецца урокам сучаснаму пакаленню аб любові да сваёй Радзімы і народа. Напрыканцы айцец настаяцель прачытаў вершы паэта “Дзед”,”Ізноў пабачыў я сялібы…”, “Народ, беларускі народ!”.

Максім Багдановіч пражыў у горадзе над Нёманам некалькі гадоў свайго маленства, з 1892 па 1896. Яго бацька, Адам Багдановіч, у гэты час працаваў у мясцовым сялянскім пазямельным банку. У 1896 г. у Гродна памерла маці паэта Марыя Багдановіч. Яе магіла захавалася да нашага часу і знаходзіцца на старых праваслаўных могілках перад Свята-Марфінскім храмам.

Неабходна заўважыць, што памінанне Максіма Багдановіча ў Праваслаўнай царкве на Беларусі мае пэўную гістарычную традыцыю. У 1917 г. у Мінску падчас набажэнства за душу паэта свяшчэннік Разумовіч прамовіў адну з першых у навейшай беларускай гісторыі беларускамоўную пропаведзь. У дзясятую гадаўшчыну смерці Багдановіча ў 1927 годзе беларуская грамадскасць Вільні арганізавала ў Свята-Троіцкай царкве жалобнае набажэнства, якое служыў па-беларуску айцец Іаан Мыслівец. Спадзяемся, што гэтая традыцыя і надалей будзе працягвацца ды здабываць сабе прыхільнікаў сярод прыхаджан і святароў Беларускай Праваслаўнай Царквы.

Аляксандр ГОРНЫ



Протаіерэй Грыгорый Бяляцкі: «Сацыяльнае служэнне Царквы заўсёды засноўваецца на людзях»



Бог ёсць Любоў, Бог ёсць міласць. І каб быць побач з Богам, каб сапраўды Яго спазнаць, мы, хрысціяне, таксама павінны быць міласцівымі, павінны любіць тых, хто вакол нас, тых, каму патрэбная наша дапамога. Нездарма галоўнымі запаветамі Госпада нашага з'яўляюцца менавіта запаветы любові. Хрыстос кажа нам: "Возлюби Господа Бога твоего всем сердцем твоим, и всею душою твоею, и всею крепостию, и всем разумением твоим. Сия есть первая и наибольшая заповедь. Вторая же подобная ей: Возлюби ближнего твоего, как самого себя".

Мы бачым з Евангельскай гісторыі, як Хрыстос не толькі моліцца, пасціцца і вучыць, але і дапамагае маламаёмасным, хворым і калекам.

Але як чалавек можа любіць Бога, якога не бачыць, калі не будзе любіць бліжняга свайго, якога бачыць. І дапамагчы выхаваць гэтую любоў, гэтую міласць можа Царква Хрыстова.

Падцвярджаннем гэтаму з'яўляецца прытча пра Страшны суд (Мф.25.34-36): «Тогда скажет Царь тем, которые по правую сторону Его: "придите благословенные Отца Моего, наследуйте Царство, уготованное вам от создания мира: ибо алкал Я, и вы дали Мне есть; жаждал, и вы напоили Меня; был странником, и вы приняли Меня; был наг, и вы одели Меня; был болен, и вы посетили Меня; в темнице был, и вы пришли ко Мне… Так как вы сделали это одному из сих братьев Моих меньших, то сделали Мне ".

Гісторыя сацыяльнага служэння пры Гродзенскай епархіі

Да 1996 года сацыяльнае служэнне ў Гродзенскай епархіі праводзілася кожным прыходам самастойна ў меру актыўнасці настаяцеляў храмаў і з улікам чалавечых і фінансавых рэсурсаў. У 1996 годзе быў арганізаваны епархіяльны Цэнтр сацыяльнай дапамогі, пасля чага сацыяльнаму служэнню стала надавацца асаблівая ўвага.

Цэнтр сацыяльнай дапамогі пры Гродзенскай епархіі аказвае матэрыяльную і фінансавую дапамогу, дапамогу прадуктамі харчавання немаёмным людзям, абслугоўвае на даму адзінокіх састарэлых людзей, хворых і інвалідаў, раз на год арганізуе адпачынак і аздараўленне дзяцей-інвалідаў і іх бацькоў у г.п. Рось.

Пасля арганізацыі сацыяльнага цэнтра ў Гродзенскай епархіі пачалі функцыянаваць сацыяльная сталовая, сацыяльная пральня, пункт прыёму і выдачы адзення маламаёмасным людзям і асобам без пэўнага месца жыхарства, валанцёрская арганізацыя "Міласэрнасць".

Так, у сацыяльнай сталовай гатуюць гарачыя абеды для дзяцей з нешчаслівых і шматдзетных сем'яў. У сацыяльнай пральні сціраюць бялізну і адзенне для людзей з абмежаванымі магчымасцямі і састарэлых. Цэнтр прыёму і выдачы аддзення займаецца прыёмам вопраткі, якая была ва ўжытку, сцірае, рамантуе яе і выдае маламаёмасным людзям і асобам без пэўнага месца жыхарства.

Валанцёры арганізацыі "Міласэрнасць" аказваюць псіхалагічную падтрымку цяжка хворым людзям у хоспісе, рыхтуюць да споведзі і прычасця тых, хто памірае, наведваюць дзяцей-інвалідаў на даму, камунікуюць і бавяць з імі час у розныя гульні, віншуюць з царкоўнымі святамі іх сям'і. Удзельнікі клуба "Нарнія" праводзяць заняткі з дзецьмі з праблемных сем'яў, арганізуюць гурткі малявання, рукадзелля, праводзяць заняткі па Законе Божым. Таксама валанцёры "Міласэрнасці" займаюцца арганізацыяй святаў і культурна-масавых мерапрыемстваў у аддзяленнях дзённага знаходжання для інвалідаў Ленінскага і Кастрычніцкага раёнаў г. Гродна.

Трэці год запар сацыяльным аддзелам ладзіцца дабрачынная акцыя "Дзень дабра", у межах якой праводзяцца канцэрты, разнастайныя майстар-класы (па арыгамі, пляценні косаў, лепцы з гліны і інш.) для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. Сабраныя сродкі ідуць на набыццё дзіцячых рэчаў, вопраткі, прадуктаў, медыкаментаў, рэабілітацыйных сродкаў. У рамках марафона "Дзень дабра" другі год запар праводзіцца выстава дзіцячай творчасці "Пасхальная вясёлка". Мэта выставы - творчае развіццё і асабісты рост дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі нароўні з дзецьмі з нядзельных школ і іншых навучальных устаноў.

Таксама пры сацыяльным аддзеле епархіі існуе інфармацыйна-кансультатыўны пункт па праблемах алкагалізму і наркаманіі, дзе людзі з алкаці нарказалежнасцю або іх сваякі могуць атрымаць кансультацыю па дадзеных праблемах. У складзе рабочай групы пункта працуюць спецыяліст-нарколаг, святар, а таксама людзі, якія маюць асабісты досвед пазбаўлення ад залежнасці.

У Гродзенскай абласной клінічнай бальніцы, пры храме Свяціцеля Лукі ажыццяўляе сваю працу валанцёрскі Цэнтр па аказанні псіхалагічнай дапамогі хворым на рак людзям. Мэта Цэнтра - аказанне дапамогі ў асэнсаванні і прыняцці захворвання.

Дасягненнямі і праблемамі ў сферы сацыяльнага служэння Праваслаўнай царквы дзеліцца начальнік аддзела царкоўнай дабрачыннасці і сацыяльнага служэння Гродзенскай епархіі Грыгорый Бяляцкі:

- Калі параўноўваць ранейшыя часы і цяперашнія, то зараз відавочны прагрэс: сацыяльная дзейнасць стала больш сістэматызаванай, больш актыўнай. Калі раней сацыяльнае служэнне трымалася, у большасці, на святарах, то зараз ёсць брацтвы, якія больш сістэмна вядуць гэтую работу. І што вельмі важна - пастаяннае сістэмнае ўзаемадзеянне ў гэтай сферы Царквы з дзяржаўнымі структурамі (бальніцамі, дамамі-інтэрнатамі, дзіцячымі дамамі). Калі раней гэта была ў асноўным ініцыятыва святара і валанцёраў, якія прыходзілі, то зараз часта заключаюцца афіцыйныя дамовы па ажыццяўленні той ці іншай

дзейнасці. Так, напрыклад, мы заключылі дамову з Цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна, кожны год распрацоўваем план сумесных мерапрыемстваў, якія рэалізуем. Аднак сацыяльнае служэнне Царквы заўсёды трымаецца на людзях. І праблема чалавечых рэсурсаў, на жаль, застаецца актуальнай і ў наш час, паколькі для такой маштабнай пладатворнай сістэмнай работы, канечне, патрэбныя людзі, гатовыя аддаваць на гэта свой час, сваю энергію і сілы.

Чамусьці многія людзі баяцца дапамагаць іншым, ахвяраваць сваім часам і сіламі. Таксама многія лічаць, што міласэрнасць і дабрачыннасць заключаецца ў грошах. Яны памыляюцца. Міласэрнасць - не абавязкова грошы, гэта проста добрае слова, слова падтрымкі. Задача хрысціяніна ўсё ж такі не замыкацца ў сабе, не баяцца быць адкрытым, не баяцца паказваць добрыя адносіны да бліжніх, а ў наш халодны, прагматычны час сеяць вакол сябе насенне цяпла, дабрыні і любові. Досвед Царквы, святых айцоў паказвае, што чалавеку, які робіць дабро, які ставіцца з любоўю да бліжняга свайго, Гасподзь заўсёды дапамагае і благаслаўляе яго. Вельмі важна, канечне, з якім сэрцам чалавек робіць дабро. У наш час многія арганізацыі ды і людзі таксама робяць добрыя справы для піяру, напаказ. І калі чалавек ганарыцца тым, што зрабіў дабро іншаму, можна сказаць, што справа сапсаваная.

Дзейнасць гродзенскіх прыходаў

Апроч таго, у благачыннях і на прыходах існуюць моладзевыя брацтвы і сястрынствы, якія актыўна ўдзельнічаюць у справах міласэрнасці.

Большасць брацтваў дапамагаюць хворым і інвалідам у гарадскіх бальніцах, дамах-інтэрнатах для састарэлых і інвалідаў. Сярод іх Свята-Барыса-Глебскае (Каложскае) брацтва, Брацтва ў імя св. роўнаапостальнага кн. Уладзіміра і Моладзевы аддзел брацтва Свята-Уладзімірскага брацтва, Свята-Сафійскае моладзевае брацтва, Моладзевае брацтва ў імя св. муч. Серафіма Жыровіцкага, Сястрынства ў гонар св. Іуліяніі Альшанскай пры Свята-Пакроўскім кафедральным саборы, Сястрынства прыходу храма свяціцеля Лукі.

Некаторыя брацтвы дапамагаюць у працы з хворымі дзецьмі, дзецьмі-інвалідамі, дзецьмі з малазабяспечаных і шматдзетных сем'яў. Так, брацтва ў імя св. роўнаапостальнага кн. Уладзіміра наведвае Дом немаўляці і выкарыстоўвае ў служэнні з дзеткамі батлейку. Моладзевае брацтва ў імя св. мч. Серафіма Жыровіцкага праводзіць ў дзіцячым доме змешанага тыпу па пр-це Я.Купалы маральныя размовы з падлеткамі і выкладае дзецям Закон Божы, аказвае матэрыяльную і духоўную падтрымку дзецям-інвалідам і адзінокім людзям на даму.

Рэшта прыходаў праводзяць актыўную работу з моладдзю. Свята-Сафійскае і Свята-Ціханаўскае моладзевыя брацтвы штотыдзень ладзяць размовы для моладзі, Моладзевае брацтва ў імя св. муч. Серафіма Жыровіцкага клапоціцца пра прыцягненне ў храм і ацаркаўленне маладых людзей. Моладзевае брацтва Свята-Марфінскага храма вядзе апякунскую работу ў Панямунскім Дзіцячым доме змешанага тыпу, у Дзіцячым рэабілітацыйным цэнтры для дзяцей-інвалідаў, Дзіцячым аддзяленні УЗДАКЦ "Псіхіятрыя-наркалогія", школе-інтэрнаце для дзяцей са слабым зрокам. Моладзевае брацтва прыходу храма прмч. Афанасія Брэсцкага ладзіць штотыднёвыя сходы моладзі для малітвы і зносін. Для больш паспяховай асветніцкай дзейнасці ў асяроддзі выхаванцаў дзіцячых дамоў горада пры брацтве арганізаваны лялечны тэатр, наладжана работа ў дзіцячым доме в. Лойкі Гродзенскага раёна.

Сястрынства ў гонар прп. Еўфрасінні Полацкай аказвае сацыяльную дапамогу дзецям-сіротам, якія засталіся на апецы апекуноў, а таксама дзецям з праблемных сем'яў.

Апроч таго, у рамках дзейнасці Аддзела па царкоўнай дабрачыннасці і сацыяльным служэнні актыўна развіваецца напрамак абароны мацярынства і сямейных каштоўнасцяў. Так, на базе прыходу Свята-Марфінскай царквы арганізаваны праваслаўны клуб шматдзетных сем'яў "Адраджэнне", мэта якога - падтрыманне шматдзетнасці і адраджэнне хрысціянскіх сямейных каштоўнасцяў. Такой жа мэты прытрымліваецца сямейны цэнтр "Рамонак" пры Іаана-Прадцечанскім храме.

Як бачым, сацыяльны адзел Гродзенскай епархіі і прыходы гродзенскіх храмаў праводзяць пастаянную разнастайную работу па сацыяльным служэнні. Жадаючыя далучыцца да служэння або атрымаць дапамогу, могуць знайсці больш падрабязную інфармацыю і кантакты кіраўнікоў на сайце Гродзенскай епархіі або непасрэдна звярнуўшыся да святароў ці служыцеляў у Свята-Пакроўскі кафедральны сабор ці ў прыход бліжэйшага храма.

Інга МАРМЫШ



Преподобная Евфросиния Полоцкая

В продолжении серии статей о жизни белорусских святых, начатой в прошлом номере нашей газеты, предлагаем читателям познакомиться с жизнеописанием преподобной Евфросинии Полоцкой, стоявшей у истоков белорусского монашества, потрудившейся на ниве книгопечания и христанского просвещения народа.

Преподобная Евфросиния Полоцкая, до пострига носившая имя Предслава, была праправнучкой святого равноапостольного князя Владимира и дочерью Полоцкого князя Георгия (Святослава) Всеславича. С детских лет она овладела грамотой, читала Псалтирь, Священное Писание и другие духовные книги. Любовь к книжному чтению сочеталась у нее с усердной молитвой, и уже тогда Предслава стяжала "плод молитвы". Мудрости ее "чудился" не только отец и близкие: слава о ней разошлась далеко за пределы Полоцкой земли. Многие князья просили руки Предславы, однако все предложения о браке она отвергала, желая стать монахиней, несмотря на несогласие родителей.

Узнав, что родители хотят обручить ее с одним из князей, она тайно ушла из дома в женский монастырь к игуменье Романе (вдове ее дяди Романа Всеславича) и начала просить пострига. Возраст Предславы (ей было тогда 12 лет) и необыкновенная красота казались игуменье несовместимыми с монашеством. Однако глубокий разум княгини, ее молитвенная настроенность скоро переубедили игуменью. Несмотря на возможный гнев отца Предславы, игуменья благословила племянницу на постриг.

При постриге Предславе нарекли имя Евфросиния. Некоторое время новопостриженная была на послушании в обители. Но даже строгая монастырская жизнь не удовлетворяла ее стремления к духовному подвигу. По благословению Полоцкого епископа Илии она удалилась в затвор, поселившись в «голубце» - особой келье при Софийском соборе города Полоцка. Здесь она проводила время в молитве, бдении и переписывании духовных книг, насыщаясь премудростью из книг соборной библиотеки. «Евфросиния сердце свое напояла Божией Премудростью», - пишет автор жития преподобной. Труды и подвиги ради собственного духовного возрастания были неотделимы для Евфросинии от деятельной любви к людям. Переписанные книги она дарила тем, кто жаждал духовного просвещения.

Святитель Димитрий Ростовский отмечает, что Евфросиния уединилась в келье Полоцкого Софийскою собора «в подражание тех древних Иерусалимских дев, среди которых была и Пречистая Дева Богородица, живших при Соломоновой Святая Святых церкви в особых комарах, при стене церковной на то устроенных».

